IX Парафіяда дзяцей і моладзі адбудзецца ў Гродне

Аўтар: Рэдакцыя
07.05.2017 00:00

Дыяцэзіяльнае мерапрыемства пройдзе 19–22 чэрвеня на тэрыторыі парафіі Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі (Паўднёвы), парафіі Найсвяцейшага Адкупіцеля (Дзевятоўка) і стадыёне ЦСК “Нёман”. Дэвіз сёлетняга спаткання – “Разам з Марыяй да Езуса”. Парафіяда – праект, заснаваны на старажытнагрэчаскай трыядзе “Святыня – Тэатр – Стадыён”. Арганізатары забяспечваюць удзельнікам харчаванне і пражыванне, выхаваўча-рэлігійную, культурную і спартыўную праграму.
†

Кошт – 3 р. (ёсць магчымасць вызвалення ад аплаты). Да ўдзелу запрашаюцца дзеці і моладзь з усёй Беларусі ва ўзросце 11–19 гадоў. Максімальная колькасць прадстаўнікоў ад адной парафіі – 15 чалавек + 1 апякун (можа быць і меншая група).

Пры сабе трэба мець аформленую медыцынскую карту ўдзельніка Парафіяды з фотаздымкам, не старэйшым за адзін год.

Паведаміць аб удзеле неабходна да 1 чэрвеня адказнаму за Парафіяду **кс. Артуру Малафею па тэл. (8 033) 624-35-22 або (8 029) 319-54-65. Лісты ўдзельнікаў (імя, прозвішча, дата нараджэння, месца жыхарства) дасылаць да 15 чэрвеня на e-mail: grodno.parafiada@mail.ru.**